# ЭКАЛАГІЧНЫ САМІТ У РЫА-ДЭ-ЖАНЭЙРА 2012 г. І ЯГО ЗНАЧЭННЕ

**Свілас С. Ф.,**
дацэнт кафедры міжнародных адносін БДУ, к. г. н.,
**Снапкоўскі С. У.,**
студэнт 5 курса факультэта міжнародных адносін БДУ

Экалагічны саміт у Рыа-дэ-Жанэйра адбыўся 20—22 чэрвеня 2012 г. Падрыхтоўка да канферэнцыі Рыа+20 вялася два з паловай гады і праходзіла на высокім узроўні. У ёй прыняло ўдзел больш за 100 кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, больш за 10 тысяч прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, экспертаў, журналістаў. Урады ўзгаднілі выніковы дакумент «Будучыня, якое мы хочам» [2; 4].

«Прарыўныя» рашэнні па двух прыярытэтных тэмах саміту аднак не былі здзейснены. Так, канцэпцыі «Зялёная эканоміка ў кантэксце ўстойлівага развіцця і ліквідацыі галечы» і «Інстытуцыйныя рамкі ўстойлівага развіцця» не былі выкананыя. Абмеркаванне першай з іх з самага пачатку тармазілася краінамі, якія развіваюцца. Меркавалася, што пераход да гэтых канцэпцый будзе спалучаны з ростам пратэкцыянізму і абмежаваннямі магчымасцяў гэтых краін у барацьбе з беднасцю. У выніку нават сама тэма «зялёная» эканоміка з цяжкасцю захавалася ў выніковым дакуменце. Але выразнага прызнання яе як новай парадыгмы эканамічнага развіцця чалавецтва не атрымалася [2].

Не ўдалося дамовіцца аб сур'ёзных рэформах па інстытуцыянальных рамках для ўстойлівага развіцця, нягледзячы на запланаваныя асобныя крокі ў гэтай галіне. У сувязі з гэтым пры ацэнцы вынікаў канферэнцыі даволі часта гучала слова «правал», а няўрадавыя арганізацыі назвалі выніковы дакумент канферэнцыі «Будучыня, якую мы не жадаем»[2].

На фоне ўсеагульнага расчаравання многія эксперты і назіральнікі, як і шэраг кіраўнікоў дзяржаў, ўсё ж адзначылі станоўчыя моманты, перш за ўсё сам факт прыняцця выніковай дэкларацыі. Ва ўмовах глыбокіх супярэчнасцей паміж краінамі, адсутнасці адзіных падыходаў да праблем атмасферы і агульнага недаверу, была рызыка, што канферэнцыя можа скончыцца без прыняцця выніковага дакументу. Важным падаецца і рашэнне аб пачатку распрацоўкі новага дакумента - Мэтаў ўстойлівага развіцця, што павінны замяніць Мэты развіцця тысячагоддзя, тэрмін якіх заканчваецца ў 2015 годзе [1; 2].

Шэраг удзельнікаў канферэнцыі абгрунтавана лічылі, што ў цяперашняй складанай міжнароднай сітуацыі нават простае пацвярджэнне раней прынятых прынцыпаў і дамоўленасцяў мае важнае значэнне. На гэтым саміце ўрадамі краін быў пацверджаны прынцып агульнай адказнасці, сфармуляваны ў Рыа-дэ-Жанейрскай дэкларацыі па навакольным асяроддзі і развіцці 1992 года. Тады краіны дамовіліся аб супрацоўніцтве ў рэчышчы глабальнага партнёрства для захавання экасістэмы Зямлі і пагадзіліся, што яны нясуць усеагульную адказнасць па гэтым пытанні. Дамовіліся, што развітыя краіны павінны ўносіць большы ўклад у захаванне навакольнага асяроддзя - як фінансавымі рэсурсамі, так і тэхналогіямі. Аднак, як паказаў час, што прайшоў пасля саміту 1992 г., развітыя дзяржавы недастаткова выконвалі рашэнні па аказанні дапамогі фінансавымі і тэхналагічнымі рэсурсамі.

У выніковым дакуменце змяшчаецца раздзел, прысвечаны «зялёнай» эканоміцы. Адзначана, што «зялёная» эканоміка ў кантэксце ўстойлівага развіцця і ліквідацыі галечы» з'яўляецца важным інструментам забеспячэння ўстойлівага развіцця. Гэтая праграма можа забяспечыць розныя варыянты фарміравання экалагічнай палітыкі, але яна не павінна быць жорсткім наборам правілаў.

Быў узгоднены набор прынцыпаў, якім павінны адпавядаць стратэгіі развіцця "зялёнай" эканомікі. Прызнана неабходным, каб краіны, якія развіваюцца, сталі на шлях рэалізацыі стратэгій развіцця «зялёнай» эканомікі. Гэту дзейнасць неабходна падтрымліваць праз аказанне ім тэхнічнай і тэхналагічнай дапамогі. Гэтая група краін, неаднаразова заяўляла аб нерэальнасці выканання абавязкаў па ўстойліваму развіццю без атрымання падтрымкі ў галіне новых тэхналогій, паляпшэння ўмоў гандлю. Яна занепакоеная ўзятымі раней абавязкамі развітых краін па прадастаўленні 0,7% ВУП на афіцыйную дапамогу для развіцця, што лічыць недастатковым [4].

Было вырашана да 2014 года падрыхтаваць прапановы аб стратэгіі фінансавання ўстойлівага развіцця пад эгідай Генеральнай Асамблеі ААН.

Рэкамендацыі па падрыхтоўцы прапановы аб стварэнні механізму садзейнічання распрацоўцы, перадачы і распаўсюджванню чыстых і экалагічна-бяспечных тэхналогій павінны быць вынесены на 67-ю сесію Генеральнай Асамблеі. На «Рыа+20» было вырашана заснаваць універсальны міжурадавы палітычны форум па ўстойлівым развіцці замест недастаткова эфектыўнай Камісіі ААН па ўстойліваму развіццю [2].

Несумненнай дасягненнем канферэнцыі «Рыа + 20» з'яўляецца магчымасць для дзясятка тысяч урадавых чыноўнікаў, міжнародных арганізацый,

прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і экспертаў сабрацца разам, абмеркаваць найважнейшыя праблемы, звязаныя з устойлівым развіццём, і даць дадатковы імпульс дзеянням па шырокаму колу пытанняў. Такія абмеркаванні вельмі важныя для таго, каб лепш зразумець розныя пункты гледжання, абмеркаваць праблемы з усіх бакоў, абмяняцца вопытам і ўсталяваць кантакты. Саміт прыцягнуў увагу міжнароднай грамадства да сітуацыі, звязанай з устойлівым развіццём у свеце, праблемам узаемасувязі паміж эканамічнымі, экалагічнымі і сацыяльнымі аспектамі «зялёнай» эканоміцы, даў магутны імпульс дыскусіям па пошуку шляхоў выратавання чалавецтва.

Пытанні, звязаныя з гандлем у кантэксце ўстойлівага развіцця, таксама актыўна абмяркоўваліся ў Рыа. У выніковым дакуменце ўтрымліваецца падраздзел «Гандаль» у раздзеле «Сродкі ажыццяўлення», які быў найбольш складаным для абмеркавання дэлегацыямі ў перыяд падрыхтоўкі канферэнцыі. У першым параграфе пацвярджаецца, што міжнародны гандаль з'яўляецца адной з рухаючых сіл развіцця і эканамічнага росту, а таксама тое, што ўніверсальная, заснаваная на правілах, адкрытая і справядлівая шматбаковая гандлёвая сістэма і рэальная лібералізацыя гандлю могуць адыграць важную ролю ў стымуляванні эканамічнага росту і развіцця ва ўсім свеце. Гэта дазволіць усім краінам рухацца наперад у напрамку ўстойлівага развіцця. Утрымліваюцца абавязкі і далей мэтанакіравана дамагацца прагрэсу ў галіне гандлю экалагічнымі таварамі і паслугамі.

У яшчэ адным параграфе раздзела змяшчаецца заклік да членаў СГА (Сусветнай гандлёвай арганізацыі) падвоіць свае намаганні для завяршэння «арыентаванага на развіццё» раўнда Доха (бягучыя гандлёвыя перагаворы вакол СГА, якія пачаліся ў лістападзе 2001 г. па рашэнні Канферэнцыі міністраў краін-членаў СГА). Шэраг істотных мерапрыемстваў пра ролю дзяржаўных закупак, сертыфікатаў, стандартаў, прыватна-дзяржаўнага партнёрства, субсідый на здабычу паліва для пераходу да "зялёнай" эканоміцы арганізаваў Міжнародны інстытут ўстойлівага развіцця (IISD). Свой уклад унёс і Міжнародны цэнтр па гандлі і ўстойліваму развіццю (ICTSD): шляхам арганізацыі Форуму па гандлі і ўстойлівым развіцці, а таксама шэрагу паралельных мерапрыемстваў, звязаных з развіццём «зялёнай» эканомікі. Значнай падзеяй стала сумеснае мерапрыемства ЮНКТАД, Дэпартамента ААН па эканамічных і сацыяльных пытаннях і ЭКЛАК, прысвечанае гандлёвым аспектам рашэнняў «Рыа+20». Прадстаўнікі Сакратарыята СГА і асабіста Генеральны дырэктар

арганізацыі Паскаль Ламі прымалі ўдзел як у афіцыйных, так і ў паралельных мерапрыемствах саміту [4].

Як засведчылі вынікі экалагічнага саміту ў Рыа-дэ-Жанэйра 2012 г., асноўная праблема заключаецца ў падыходах нацыянальных урадаў, а таксама супярэчнасцях і нежаданні знайсці кампраміс для дасягнення мэтаў глабальнай ўстойлівасці паміж краінамі, асабліва групамі багатых і бедных краін. Стары парадак, калі развітыя краіны навязвалі ўсяму свету сваю пазіцыю, ужо знікае - а новы, калі ўлічваюцца інтарэсы ўсіх, яшчэ не склаўся.


БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Саммит ООН по устойчивому развитию открывается в Рио-де-Жанейро [Элекронны рэсурс]. - https://ria.ru/world/20120620/677172340.html. - Дата доступу: 20.01.2017.
2. Саммит "Рио+20": будущее, которого хотят не все [Элекронны рэсурс] https://ria.ru/nature/20120623/679787921.html. - Дата доступу: 20.01.2017.
3. Johnson, S. UNEP: the first 40 years. A narrative. New York, United National Environmental Program 2012. 297 p. - Дата доступу: 20.01.2017.
4. Итоговый документ Рио + 20 "Будущее, которого мы хотим". [Элекронны рэсурс]. - http://www.unepcom.ru/development/rio20m.html. - Дата доступу: 21.01.2017.


## НОРМАТИВНО-ПРАВОВАЯ БАЗА БЕЛОРУССКО-КИТАЙСКОГО СОТРУДНИЧЕСТВА В СФЕРЕ ОБРАЗОВАНИЯ И НАУКИ


**Ян Синцзюань,**
аспирант факультета международных отношений БГУ


Договорно-правовая база двухсторонних отношений Китая и Беларуси постоянно развивается и расширяется. Начиная с установления дипломатических отношений между Китаем и Беларусью (20 января 1992 г.) до государственных визитов двух стран 2016 г. были подписаны 63 соглашения, 12 меморандумов и протоколов. В 10 соглашениях и 2 меморандумах оговаривались вопросы сотрудничества в сфере образования и науки.

На современном этапе белорусско-китайского взаимодействия основополагающим правовым документом стал Договор о дружбе и сотрудничестве между Республикой Беларусь и Китайской Народной Республикой, подписанный 10 мая 2015 г. в Минске Председателем КНР Си Цзиньпином и Президентом Республики Беларусь А. Г. Лукашенко.